**Любоў Турмасава**

**Загадчыца аддзела Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага**

# Першыя Шчорсаўскія чытанні на Гродзеншчыне

Гродзенская абласная бібліятэка імя Я.Ф. Карскага ініцыявала новы праект. Яго мэта – даследаванне гісторыі і развіцця бібліятэчнай справы на Гродзеншчыне. У межах гэтага праекта ў гістарычным мястэчку Шчорсы на Навагрудчыне адбыліся Першыя Шчорсаўскія чытанні «Развіццё бібліятэчнай справы на Гродзеншчыне: дзяржаўныя і прыватныя кнігазборы». Арганізатары гэтых чытанняў – Навагрудскі райвыканкам, Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага, кафедра гісторыі Беларусі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы (ГрДУ імя Я. Купалы), Навагрудская цэнтральная раённая бібліятэка. Гістарычнай падзеяй для ўсёй Беларусі назваў гэтыя чытанні прафесар Энгельс Канстанцінавіч Дарашэвіч.

Гродзеншчына і Навагрудчына былі буйнейшымі і значнымі цэнтрамі развіцця бібліятэчнай справы на Беларусі. Бібліятэчная справа на Гродзеншчыне мае васьмісотгадовую гісторыю. Першыя бібліятэкі ўзніклі яшчэ ў часы Гарадзенскага княства, і першая навуковая медыцынская бібліятэка (1775), і першая публічная бібліятэка (1830) былі заснаваны ў Гродне.

Славіліся ў Еўропе і магнацкія бібліятэкі з Гарадзеншчыны. Буйнейшыя сярод іх – бібліятэкі Храптовічаў і Сапегаў. Прыватны кнігазбор Сапегаў быў другім па велічыні ў Беларусі (пасля бібліятэкі Радзівілаў). Стваральнікамі гэтых бібліятэк былі першыя асобы ў Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ): канцлер ВКЛ Леў Сапега, дзяржаўны, гаспадарчы, навуковы і культурны дзеяч ВКЛ Іахім Храптовіч.

Таму нядзіўна, што мэта Першых Шчорсаўскіх чытанняў – асэнсаваць значэнне і вартасць гістарычных кнігазбораў Гродзеншчыны і Навагрудчыны, выявіць асаблівасці іх фарміравання, захавання і даследавання ў кантэксце кніжнай культуры і, несумненна, ушанаванне багацейшай бібліятэкі Храптовічаў.

У чытаннях прынялі ўдзел навукоўцы, краязнаўцы, супрацоўнікі музеяў і бібліятэк з Беларусі і Польшчы. Тэмамі для абмеркавання былі вылучаны: «Уклад Іахіма Ігнацы Юзафа Храптовіча ў развіццё культуры ВКЛ», «Бібліятэка Храптовічаў: сучасны стан і перспектывы даследавання», «Гісторыя і развіццё бібліятэчнай справы на Гродзеншчыне», «Кнігадрукаванне на Гродзеншчыне: гісторыя і сучаснасць». З грунтоўнымі і змястоўнымі дакладамі выступілі доктар гістарычных навук, прафесар ГрДУ імя Я. Купалы Д.У. Караў, прафесары Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Э.К. Дарашэвіч, А.У. Рагуля, кандыдаты гістарычных навук, дацэнты ГрДУ імя Я. Купалы С.У. Амелька, В.Р. Карнялюк, дырэктар Падляскай ваяводскай бібліятэкі імя Я. Гурніцкага Ян Леанчук, кандыдат медыцынскіх навук, выкладчык Гродзенскага медыцынскага каледжа Ф.І. Ігнатовіч, настаўнік гісторыі Кашалёўскага дзіцячага сада – базавай школы, аспірант ГрДУ імя Я. Купалы М.В. Ярашук, дырэктар Навагрудскай ЦБС Т.М. Мішкіна і інш.

Усіх прысутных зачаравала выстаўка народнага мастацтва «Творчасць маіх землякоў». Вялікую цікавасць выклікала галерэя інтэлектуальнай спадчыны «Шчорсаўскія скарбы», дзе былі прадстаўлены энцыклапедычныя выданні, кнігі, архіўныя дакументы, фотаздымкі аб слаўнай гісторыі Шчорсаў. Прыцягвалі ўвагу і прадстаўленыя выдавецкія працы Навагрудскай ЦБС, якія далі магчымасць пазнаёміцца з цікавым падыходам да збору краязнаўчых матэрыялаў, іх групоўкай і выкарыстаннем бібліяграфічных дапаможнікаў у папулярызацыі свайго раёна.

На Першых Шчорсаўскіх чытаннях было прынята рашэнне хадайнічаць перад мясцовымі ўладамі аб наданні імя Іахіма Храптовіча Навагрудскай цэнтральнай раённай бібліятэцы. Шчорсаўскія чытанні мяркуецца зрабіць традыцыйнымі і праводзіць раз у два гады. Тэма наступных чытанняў – «Гісторыя і развіццё манастырскіх і царкоўных бібліятэк на Гродзеншчыне».

## Summary

In the article it's told about The Shchorsov Readings which were carried out for the first time and were devoted to development of a library science in Grodno region and so to the state and private book collections.